Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Вучэбна-метадычнае аб’яднанне па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы намеснік
Міністра адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________________ А. Г. Бахановіч
_____________________________
Рэгістрацыйны № _____________

**УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ**
**Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне**
**для спецыяльнасці**
**6-05-0314-02 Культуралогія**

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік аддзела ўстаноў
адукацыі Міністэрства культуры
Рэспублікі Беларусь
________________ М. Б. Юркевіч
___________________

**УЗГОДНЕНА**
Начальнік Галоўнага ўпраўлення
прафесійнай адукацыі
Міністэрства адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________________ С. М. Пішчоў
___________________

Старшыня вучэбна-метадычнага
аб’яднання па адукацыі ў галіне
культуры і мастацтваў
______________ Н. У. Карчэўская
________________

Прарэктар па навукова-метадычнай
рабоце дзяржаўнай установы адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут вышэйшай
школы»
________________ І. У. Цітовіч
________________________

Эксперт-нормакантралёр
_________________________
_________________________

Мінск 2025

**СКЛАДАЛЬНІК**
*А. І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*кафедра* маладзёжнай палітыкі і сацыякультурных камунікацый дзяржаўнай установы адукацыі «Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы»;
*Ю. В. Кавалёва,* загадчык аддзела экспазіцыйна-выставачнай работы дзяржаўнай установы «Музей гісторыі горада Мінска», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ Ў ЯКАСЦІ ПРЫКЛАДНАЙ:**
*кафедрай культуралогіі* ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 19.02.2025);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 26.02.2025);
*навукова-метадычным саветам* па культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці, сацыяльна-культурным менеджменце і камунікацыях вучэбна-метадычнага аб’яднання па адукацыі ў галіне культуры і мастацтваў (пратакол № 2 ад 28.02.2025)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. І. Смолік

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне складзена для студэнтаў спецыяльнасці агульнай вышэйшай адукацыі 6-05-0314-02 Культуралогія ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам і прыкладным вучэбным планам. Выкладанне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць» прадугледжана на першым курсе.

*Мэтай* дадзенай вучэбнай дысцыпліны з’яўляецца спасціжэнне студэнтамі культурнага сэнсу сваёй будучай прафесійнай дзейнасці, паглыбленне прафесійнай арыентацыі студэнтаў, разуменне зместу і форм культуралагічнай адукацыі, стварэнне базы для прафесійнай камунікацыі. Азначаная вучэбная дысцыпліна закладвае ў першакурснікаў базавыя, ключавыя паняцці, якія складаюць тэарэтычную аснову для разумення праблематыкі культуры.

Асноўнымі *задачамі* вучэбнай дысцыпліны з’яўляюцца:

– азнаямленне з сучаснымі тэхналогіямі навучання, самастойнага засваення гуманітарных ведаў;

– фарміраванне ўяўленняў аб кампанентах прафесійнай кампетэнтнасці, формах і метадах прафесійнай дзейнасці выкладчыка, даследчыка культурных феноменаў.

Вучэбная дысцыпліна «Уводзіны ў спецыяльнасць» мае міжпрадметныя сувязі, а таксама з’яўляецца падмуркам для вывучэння такіх вучэбных дысцыплін, як «Тэорыя культуры», «Гісторыя культуры», «Асновы сіналогіі», «Сучасная замежная культуралогія», «Сучасныя галіны культуралагічных ведаў» і г. д.

У адпаведнасці з адукацыйным стандартам агульнай вышэйшай адукацыі і прыкладным планам па спецыяльнасці 6-05-0314-02 Культуралогія вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў наступных *універсальных кампетэнцый:*

– Рашаць стандартныя задачы прафесійнай дзейнасці на аснове інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій.

– Быць здольным да самаразвіцця і ўдасканалення ў прафесійнай дзейнасці.

Студэнты павінны набыць наступныя *базавыя прафесійныя кампетэнцыі:*

– Разумець мэту і задачы будучай прафесіі.

– Ажыццяўляць інфармацыйны пошук у розных дакументных патоках і асноўных інфармацыйна-пошукавых сістэмах, праводзіць аналітыка-сінтэтычную апрацоўку інфармацыі, дакументальна афармляць вынікі інфармацыйнага пошуку.

У выніку засваення зместу вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– змест вучэбнага плана на ўвесь перыяд навучання;

– спецыфіку авалодання прафесіяй выкладчыка, даследчыка з'яў, працэсаў культуры, у тым ліку і кітайскай культуры;

– кваліфікацыйную характарыстыку і кампетэнцыі педагога і навукоўца ў сферы культуры;

– абавязкі і правы студэнта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў.

Студэнт павінен *умець:*

– арыентавацца ў структурных падраздзяленнях універсітэта (факультэт, кафедра, бібліятэка, грамадскія аб'яднанні, мастацка-творчыя калектывы і г. д.);

– працаваць з вучэбнай, інфармацыйна-даведачнай і навуковай літаратурай;

– рацыянальна размяркоўваць працоўны і вольны час;

– асэнсоўваць сутнасць працэсаў, якія адбываюцца ў сацыядынаміцы сусветнай, беларускай і кітайскай культурах.

Студэнт павінен *валодаць:*

– канцэптуальнай і метадалагічнай базай у рамках праблемнага поля дысцыпліны;

– міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне студэнт павінен не толькі набыць тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым і сацыяльна-культурным жыцці краіны.

Прыкладным вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць» усяго прадугледжваецца 90 гадзін, з іх 54 гадзіны – аўдыторныя заняткі. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: 24 гадзіны – лекцыі, 30 – семінарскія заняткі.

Рэкамендаваная форма выніковага кантролю ведаў студэнтаў – залік.

# ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Нумар тэмы | Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | |
|---|---|---|---|
| | | лекцыі | семінарскія заняткі |
| 1 | Уводзіны | 2 | |
| 2 | Культуралогія як эксплiцытная форма ведаў аб феноменах культуры | 6 | 4 |
| 3 | Спецыяльнасць 6-05-0314-02 Культуралогія ў кантэксце сучаснага гуманітарнага дыскурсу | 6 | 4 |
| 4 | Галіны культуралагічных ведаў | 4 | 2 |
| 5 | Змест прыкладнага вучэбнага плана і вучэбных праграм па спецыяльнасці 6-05-0314-02 Куль-туралогія | 2 | 4 |
| 6 | Спецыфіка арганізацыі вучэбнай, навукова-даследчай і самастойнай працы студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0314-02 Культуралогія | 4 | 4 |
| 7 | Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па культуралогіі | | 4 |
| 8 | Аналіз культуралагічных тэкстаў | | 4 |
| 9 | Практыка падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў | | 2 |
| 10 | Віды і формы студэнцкай навукова-даследчай дзейнасці | | 2 |
| | Усяго… | 24 | 30 |

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## Тэма 1. Уводзіны

Значэнне вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць» у працэсе падрыхтоўкі кадраў для сацыякультурнай сферы. Сувязь з іншымі сацыягуманітарнымі вучэбнымі дысцыплінамі. Віды вучэбных заняткаў і формы кантролю. Агульныя звесткі аб сістэме падрыхтоўкі культуралагічных кадраў у Рэспубліцы Беларусь. Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў – вядучая ўстанова ў сістэме адукацыі па культуры і мастацтве. Структурныя падраздзяленні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў. Факультэт культуралогіі і сацыяльна-культурнай дзейнасці і яго роля ў падрыхтоўцы кадраў для сферы.

Патрабаванні дзяржавы і грамадства да сучаснага спецыяліста сацыякультурнай сферы. Трансляцыя, захаванне і ўзнаўленне артэфактаў духоўнай і матэрыяльнай культуры – важнейшыя функцыі культуролага.

Кампаненты прафесійнай кампетэнтнасці і спектр прафесійнай дзейнасці сучаснага культуролага. Аналіз стану рынкаў працы і прафесій сацыякультурнай сферы. Магчымасці працаўладкавання ў навучальных і навукова-даследчых установах нашай краіны і замежжа.

Перспектывы бесперапыннай культуралагічнай адукацыі (магістратура, аспірантура, дактарантура, інстытуты перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі).

## Тэма 2. Культуралогія як экспліцытная форма ведаў аб феноменах культуры

Генезіс культуры, асноўныя тэорыі генезіса культуры (рэлігійная, працоўная, эвалюцыйная, гульнявая і інш.). Сучасная інтэрпрэтацыя сутнасці і зместу культуры.

Працэс станаўлення і развіцця філасофіі, сацыялогіі, антрапалогіі, семіётыкі, аксіялогіі і іншых гуманітарных галін ведаў аб культуры як этымалагічнай загадцы. Узнікненне культуралогіі і яе ўзаемадзеянне з рознымі сацыягуманітарнымі навуковымі дысцыплінамі. Станаўленне на мяжы стагоддзяў (XX–XXI) новых культуралагічных дысцыплін (філасофія культуры, сацыялогія культуры, культурная антрапалогія, прыкладная культуралогія). Развіццё культуралагічнай думкі ў Рэспубліцы Беларусь.

## Тэма 3. Спецыяльнасць 6-05-0314-02 Культуралогія ў кантэксце сучаснага гуманітарнага дыскурсу

Культуралогія як інтэграваная навука аб сутнасці, формах, відах, марфалогіі, функцыях культуры. Культуралагічная адукацыя і агульная

характарыстыка сучаснага этапу яе развіцця ў розных краінах свету. Праграмы падрыхтоўкі і кваліфікацыйныя ўзроўні культуралагічных кадраў у Рэспубліцы Беларусь.

Дзяржаўны адукацыйны стандарт вышэйшай прафесійнай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0314-02 Культуралогія як аснова адзіных патрабаванняў да прафесійных кампетэнцый выпускніка. Тэарэтычнае і практычнае засваенне ведаў па тэорыі і гісторыі культуры. Сродкі, формы, метады і сучасныя адукацыйныя тэхналогіі вышэйшай школы.

Самастойная пазнавальная дзейнасць як важнейшая форма культуралагічнай адукацыі.

## Тэма 4. Галіны культуралагічных ведаў

Тэарэтычная культуралогія і яе роля ў вызначэнні параметраў спецыфікі культуралагічных ведаў у цэлым. Анталагічныя асновы тэорыі культуры.

Антрапалагічныя аспекты тэорыі культуры: свет чалавека. Гнасеалагічныя асновы вывучэння культуры. Аксіялагічныя аспекты тэорыі культуры.

Гістарычная культуралогія як аснова спасціжэння спосабу існавання вялікіх і малых сацыякультурных сістэм.

Прыкладная культуралогія і яе спецыфіка. Задачы, метадалагічныя асновы прыкладной культуралогіі.

## Тэма 5. Змест прыкладнага вучэбнага плана і вучэбных праграм па спецыяльнасці 6-05-0314-02 Культуралогія

Вучэбны план падрыхтоўкі спецыялістаў-культуролагаў і яго структура. Агульная характарыстыка вывучаемых цыклаў і вучэбных дысцыплін (агульных гуманітарных і прыродазнаўчых; агульнапрафесійных; спецыяльных). Педагагічная і вытворчая практыка. Вучэбныя праграмы.

Падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, манаграфіі і хрэстаматыі па культуралагічных дысцыплінах. Навуковыя перыядычныя выданні па праблемах культуралогіі.

Вучэбна-метадычны комплекс і яго структура. Каляндарны графік вучэбнага працэсу па гадах. Прафесарска-выкладчыцкі склад кафедры культуралогіі і сумежных кафедраў.

## Тэма 6. Спецыфіка арганізацыі вучэбнай, навукова-даследчай і самастойнай працы студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0314-02 Культуралогія

Вучэбная, навуковая інфармацыя і яе крыніцы (лекцыя, семінар, самастойная работа з папяровымі і электроннымі носьбітамі інфармацыі).

Першасныя і другасныя крыніцы вучэбна-навуковай інфармацыі па гуманітарных дысцыплінах.

Магчымасці сусветнай электроннай сеткі для папаўнення культуралагічных ведаў. Агульная характарыстыка спецыялізаваных інтэрнэт-сэрвісаў (сайтаў базавых акадэмічных структур, навукова-даследчых і аналітычных устаноў культуралагічнага профілю, навукова-тэарэтычных часопісаў).

Формы вучэбнай дзейнасці ў сучаснай вышэйшай школе: лекцыя, семінар, практычныя заняткі, розныя віды навукова-даследчай дзейнасці. Работа з канспектам, папяровай і электроннай інфармацыяй.

Бюджэт часу студэнтаў, планаванне працоўнага часу і адпачынку з улікам асабістага біярытму студэнта. Арганізацыя быту і патрабаванні да культуры быту.

Віды і формы грамадскай дзейнасці студэнтаў (БРСМ, прафсаюз, студэнцкае самакіраванне). Мастацка-творчая дзейнасць студэнтаў (калектывы мастацкай самадзейнасці, КВЗ, конкурсы, кастынгі, фестываль «Артмажор» і інш.). Студэнцкае спартыўнае жыццё.

### Тэма 7. Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па культуралогіі

Вучэбныя праграмы як арыенціры на фундаментальнае спасціжэнне будучымі спецыялістамі матэрыяльнай і духоўнай нацыянальнай культуры. Вучэбна-метадычныя комплексы як сістэмныя па характары і структуры метадычныя распрацоўкі па культуралогіі.

Падручнікі па культуралогіі беларускіх і замежных аўтараў па вывучэнні сучаснай навукі аб культуры.

Вучэбныя дапаможнікі па культуралогіі з грыфам «Дапушчана Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь у якасці вучэбнага дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі».

Вучэбныя дапаможнікі з грыфам вучэбна-метадычных аб’яднанняў УВА.

### Тэма 8. Аналіз культуралагічных тэкстаў

Культура як тэкст. Герменеўтыка – тэорыя і агульныя правілы разумення тэкстаў культуры. Дыскурс як новая тэхніка вывучэння культуры. Аналіз сімвалічнай сутнасці культуры як аснова разумення культурных артэфактаў. Выкарыстанне метадаў семіялогіі да спасціжэння культуры як сістэмы знакаў. Разнастайнасць аксіялагічнага разумення свету культуры.

Постмадэрнісцкая трактоўка сутнасці, зместу і функцый культуры.

## 9. Практыка падрыхтоўкі да семінарскіх заняткаў

Семінар як вучэбна-практычны занятак у форме калектыўнага паглыбленага вывучэння ключавых праблем культуралогіі. Выпрацоўка з дапамогай вуснага паведамлення, даклада, рэферата на аснове аналізу лекцыйнага матэрыялу, дадатковай літаратуры ўласнага погляду на вызначаную праблему культуралогіі.

Формы семінараў. Разгорнутая гутарка па абазначаных пытаннях тэмы. Круглы стол як абагульняючы занятак па пэўным раздзеле праграмы. Дыскусія па абмяркоўваемых рэфератах, дакладах і паведамленнях. Семінар-канферэнцыя і інш.

## 10. Віды і формы студэнцкай навукова-даследчай дзейнасці

Правільны выбар тэмы, абазначэнне асноўнай праблемы даклада і рэферата. Распрацоўка прэзентацыі па тэме даклада і рэферата. Падбор літаратуры і крыніц па вызначанай праблеме.

Падрыхтоўка артыкула для студэнцкай навуковай канферэнцыі. Структура артыкула: уводзіны, асноўны змест, заключэнне, спіс выкарыстанай літаратуры і крыніц. Пошук і афармленне ілюстратыўнага аўдыявідэаматэрыялу.

Удзел у рэспубліканскіх і міжнародных навукова-практычных канферэнцыях, конкурсах, алімпіядах, касцінгах.

Бюджэт часу студэнтаў, планаванне працоўнага часу і адпачынку з улікам асабістага біярытму студэнта. Арганізацыя быту і патрабаванні да культуры быту.

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Борко, Т. И.* Культурная антропология : учебник для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / Т. И. Борко. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Юрайт, 2022. – 208, [1] с. : ил., табл. – С. 12–79, 86–113, 95–157, 170–200.

2. *Комиссарова, Т. С.* Культурология: практикум : учеб. пособие / Т. С. Комиссарова, А. Ю. Цыгоняева. – 2-е изд., испр. и доп. – СПб. : СПбГУТ им. М. А. Бонч-Бруевича, 2022. – 50 с. – URL: https://e.lanbook.com/book/279308.

3. *Смолік, А. І.* Культуралогія : вучэб.-метад. комплекс [па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці 1-21 04 01 «Культуралогія», спецыялізацыі 1-21 04 01-01 01 «Тэорыя і гісторыя культуры»]. Раздзел 1. Тэорыя культуры / А. І. Смолік, Л. К. Кухто, С. Л. Шпарло. – Мінск : БДУКМ, 2017. – 342 с. – С. 115–189, 189–321, 293–340.

4. *Хэ Чанлин.* История китайской цивилизации / Хэ Чанлин ; [пер. с кит. Н. И. Рыбалко]. – М. : Шанс, 2021. – 196 с.

*Дадатковая*

1. *Бондарь, Ю. П.* Культура как образование: теоретико-прикладной анализ : моногр. / Ю. П. Бондарь, А. И. Смолик ; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств; науч. ред. П. И. Бондарь. – Минск : БГУКИ, 2015. – 301 с.

2. *Борзова, Е. П.* Сравнительная культурология : учебник для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / Е. П. Борзова. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Юрайт, 2021. – 554 с.

3. *Грыгаровіч, Я. Д.* Падрыхтоўка кадраў культуры ў Рэспубліцы Беларусь: сучасны стан і перспектывы / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік, Л. М. Рагачова ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры. – Мінск, 2001. – 158 с.

4. *Грыгаровіч, Я. Д.* Прыкладная культуралогія : вучэб. дапам. для студэнтаў спецыяльнасці «Культуралогія» ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / Я. Д. Грыгаровіч, А. І. Смолік. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2005. – 216 с. : іл.

5. *Елисеев, О. П.* Культурно-историческая антропология : учебник для студентов высших учебных заведений, обучающихся по гуманитарным направлениям / О. П. Елисеев. – 3-е изд. – М. : Юрайт, 2022. – 468 с.

*6.* Кітайска-беларускі слоўнік. Беларуска-кітайскі слоўнік / пад навук. рэд. І. Л. Капылова. – Мінск : Выд. Цэнтр БДУ, 2021. – 870 с.

*7.* Культурология : учебник для студентов учреждений высш. проф. образования / [К. Г. Антонян, Т. Г. Артемьева, В. А. Белоус и др.]; под ред. Л. М. Мосоловой. – М. : Издат. центр «Академия», 2013. – 352 с.

*8. Лоу Юйле.* Духоўныя асновы кітайскай культуры / Юйле Лоу ; [пер. с кит. А. С. Чэкулаева]. – Мінск : Восточная культура, 2020. – 238 с.

*9. Мацель, В. М.* Беларусь – Китай: 30 лет по пути дружбы и взаимовыгодного сотрудничества : [монография] / В. М. Мацель. – Минск : [Академия управления при Президенте Республики Беларусь], 2021. – 383 с.

*10. Паўлава, С. А.* Уводзіны ў спецыяльнасць : метад. дапам. / С. А. Паўлава. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў, 2009. – 56 с.

*11.* Практыка як састаўная частка прафесійнай падрыхтоўкі спецыялістаў для сацыякультурнай сферы : матэрыялы рэсп. навук.-метад. канф. (1–2 лютага 2001 г.), Беларус. ун-т культуры ; рэдкал.: А. І. Смолік (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2009. – 311 с.

*12. Свергунова, Н. М.* Подготовка кадров для социально-культурной сферы в условиях магистратуры творческого вуза / Н. М. Свергунова // Образование и культурное пространство. – 2022. – № 1. – С. 67–78.

*13. Смолік, А. І.* Беларуская культуралогія: гісторыя і сучаснасць / А. І. Смолік ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2014. – 276 с.

*14. Смолік, А. І.* Гісторыя беларускай культуралагічнай думкі : вучэб.-метад. дапам. / А. І. Смолік, Л. К. Кухто ; М-ва культуры Рэсп. Беларусь ; Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Мінск : БДУКМ, 2011. – 236 с.

## Метады (тэхналогіі) навучання

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага рашэння задач, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і другія актыўныя формы і метады).

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання ўніверсальных і базавых прафесійных кампетэнцый студэнтаў установы вышэйшай адукацыі ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

## Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

У якасці аднаго з элементаў выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў магчыма выкарыстоўваць крытэрыяльна-арыенціровачныя тэсты, якія ўяўляюць сабой сукупнасць тэставых заданняў закрытай формы з адным альбо некалькімі варыянтамі правільных адказаў; заданні на выяўленне адпаведнасці паміж элементамі двух варыянтаў з адным альбо некалькімі суадносінамі і роўнай альбо рознай колькасцю элементаў варыянтаў; заданні адкрытай формы з фармалізаваным адказам; заданні на ўсталяванне правільнай паслядоўнасці.

## Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў

У рамках вывучэння вучэбнай дысцыпліны «Уводзіны ў спецыяльнасць» самастойная работа ажыццяўляецца пад кіраўніцтвам выкладчыка (кіруемая), а таксама самастойна студэнтам з улікам яго асаблівасцей успрымання і перапрацоўкай інфармацыі і зацікаўленасці ў больш паглыбленым вывучэнні дадзенай дысцыпліны.

Кіруемая самастойная работа студэнтаў прадугледжвае больш паглыбленае вывучэнне некаторых тэм («Галіны культуралагічных ведаў», «Падручнікі і вучэбныя дапаможнікі па культуралогіі») за межамі аўдыторыі; напісанне рэфератаў па індывідуальных тэмах і прадстаўленне дакладаў з прэзентацыямі на семінарскіх занятках; выкананне індывідуальных заданняў (пісьмовае апытанне з кансультацыямі выкладчыка).

*Вучэбнае выданне*

**УВОДЗІНЫ Ў СПЕЦЫЯЛЬНАСЦЬ**

**Прыкладная вучэбная праграма па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасці
6-05-0314-02 Культуралогія**

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2025. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Лічбавы друк.
Ум. друк. арк. . Ул.-выд. арк. . Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.